# Прамова К. Т. МАЗУРАВА

Таварышы!

Спартакіяда народаў СССР праходзіць у знамянальныя дні падрыхтоўкі да ўсенароднага свята — 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Веліч Кастрычніка заключаецца ў тым, што ён адкрыў новую эру сусветнай гісторыі, эру крушэння капіталізму, павярнуў лёс народаў на шлях сацыялізма. Лозунгі Кастрычніка, ідэі марксізма-ленінізма сталі цяпер практычнай справай савецкіх людзей.

Наш народ па праву ганарыцца паўвекавым юбілеем сваёй сацыялістычнай Радзімы. Уся краіна з велізарным натхненнем рыхтуецца дастойна сустрэць яго. Новыя поспехі дасягнуты на фабрыках і заводах, у саўгасах і калгасах, у навучальных і іншых установах, у раёнах, абласцях і рэспубліках. Удзельнікі спартакіяды — рабочыя і калгаснікі, працоўная інтэлігенцыя, студэнты, школьнікі, воіны нашых слаўных Узброеных Сіл — азнаменавалі спартакіяду новымі выдатнымі поспехамі ў працы, вучобе і спорце.

Камуністычная партыя Савецкага Саюза, Савецкі ўрад ўдзяляюць пастаянную ўвагу развіццю масавай фізічнай культуры і спорту ў нашай краіне, фізічнаму ўдасканаленню падрастаючага пакалення, ідэйнаму і ваенна-патрыятычнаму выхаванню са-

якасці ўласцівыя ўсёй нашай моладзі, усяму савецкаму народу. У гэтым адна з крыніц несакрушальнай магутнасці нашага ладу, залог таго, што ніякім сілам імперыялізму, рэакцыі і вайны не ўдасца павярнуць назад ход гісторыі, перашкодзіць нашаму руху наперад, да камунізма.

Ваяўнічыя сілы сусветнага імперыялізму ўсё часцей за апошні час ужываюць небяспечныя авантуры. Злачынная вайна ЗША ў В'етнаме, нахабны напад Ізраіля на арабскія краіны яшчэ раз паказваюць, як важна сілам сацыялізма і прагрэсу заўсёды быць гатовымі да адпору агрэсіўным падкопам імперыялізму.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы